# МУЗЕЙ У САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ РЭГІЁНА

*М.А.Бяспалая,*
загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар гістарычных навук, прафеср

У дакладзе Міністра культуры Рэспублікі Беларусь П. П. Латушкі Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі: стратэгія пачатку» на выніковай калегіі Міністэрства культуры 8 лютага 2012 г. падкрэслівалася, што прыярытэтнае значэнне надаецца культурнаму развіццю рэгіёнаў. Безумоўна, у гэтым шматвектарным працэсе адно з галоўных месцаў займае рэгіянальны музей, як самы выразны маркер культурнай самабытнасці дадзенай мясцовасці, яе захавальнік і транслятар. Менавіта ў апошнім кірунку музей самым цесным вобразам павінен супрацоўнічаць з іншымі рэгіянальнымі сацыякультурнымі ўстановамі.

На сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь дзейнічае каля 140 рэгіянальных музеяў – абласных, гарадскіх і раённых, якія складаюць большую частку дзяржаўнай музейнай сеткі. Адпаведна існуючай класіфікацыі сярод іх 50 % складаюць краязнаўчыя, 23 % – гістарычныя, 13 % – мастацкія, 10% – літаратурныя і 4 % – іншыя музеі.

Як вядома, сёння існуе даволі прыкметная канкурэнцыя ў арганізацыі вольнага часу і асноўнымі канкурэнтамі музея выступаюць як установы сферы культуры (клубы, бібліятэкі, кінатэатры), так і ўстановы сферы дадатковай адукацыі, а таксама тэлебачанне, Інтэрнэт, а ў дадатак і тыя магчымасці, якія прадстаўляюць сучасныя тэхналогіі. Аднак, на наш погляд, на рэгіянальным узроўні існуе больш перадумоў, каб ператварыць сваіх канкурэнтаў у партнёраў. Мы лічым, што супрацоўніцтва з іншымі ўстановамі сацыякультурнай сферы праз стварэнне сумесных праектаў і праграм па прынцыпе ўзаемадапаўнення вельмі апраўданы кірунак у дзейнасці музеяў. Асаблівую значнасць, на нашу думку, атрымаюць тыя праекты, якія ўлічваюць спецыфіку пэўнага рэгіёна. Супрацоўніцтва паміж сацыякультурнымі ўстановамі будзе спрыяць пашырэнню форм дзейнасці музея, бо тое, што немагчыма арганізаваць невялікім калектывам раённага музея, з лёгкасцю ажыццяўляецца пры ўдзеле

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дадатковых партнёраў. Напрыклад, з удзелам аддзела адукацыі могуць быць арганізаваны алімпіяды, віктарыны, конкурсы на краязнаўчую тэматыку, пры ўдзеле Дома культуры ці школы мастацтваў значна прасцей арганізаваць свята ці экскурсію-анімацыю і г.д.

У вышэйзгаданым дакладзе звярталася ўвага на неабходнасць падтрымкі ў рэгіёнах тых кірункаў народнай творчасці, якія асабліва могуць зацікавіць дзяцей і падлеткаў. У абгрунтаванне гэтай задачы Міністр культуры спаслаўся на вынікі маніторынгу Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, згодна з якім узровень арганізацыі дасуга падлеткаў недастатковы і, як адна з прычын гэтага разглядаецца недастатковая распрацоўка сучасных форм баўлення вольнага часу ў сацыякультурных установах рэгіёна.

Што можа прапанаваць рэгіянальны музей для вырашэння пастаўленай задачы? На нашу думку, многае, хаця пытанне аб перспектыўных формах культурна-адукацыйнай дзейнасці рэгіянальных музеяў надзвычай актуальнае і дыскусійнае. Справа не толькі ў пошуку новых форм, а, на наш погляд, у распрацоўцы прынцыповай пазіцыі ў гэтым пытанні. Калі мы прызнаем неабходнасць камерцыялізацыі музейнай дзейнасці, тады мы павінны і рухацца па шляху далучэння і адаптацыі яе да індустрыі забаў і адпачынку. Гэты кірунак будзе якраз і адказваць запытам сучаснага маладога наведвальніка і тым самым садзейнічаць уключэнню музея ў сферу масавай культуры. Ці мы пагодзімся з тым, што частка наведвальнікаў прадаўжае чакаць ад музея высокай інтэлектуальнай культуры ў змесце экспазіцыі і ў яе падачы, што яны прыходзяць у музей каб сустрэцца з артэфактамі, якія раскрываюць змест і своеасаблівасць нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны. На наш погляд, другая пазіцыя ў дзейнасці музеяў таксама павінна захоўвацца і ўдасканальвацца, бо пакуль што вельмі многія прыходзяць у музей за інфармацыяй, якую прадстаўляе музейны прадмет, а не толькі дзеля забаўляння.

Дыскусія аб спалучэнні традыцыйных і інавацыйных форм і метадаў культурна-адукацыйнай дзейнасці музея даволі часта выклікае боязь страціць спецыфіку музея, яго навукова-даследчы складнік, і пераўтварэння ў чыста рэкрэацыйную ўстанову. Аднак, на нашу думку, паміж традыцыйнымі і сучаснымі падыходамі няма вялікай супярэчнасці, яны не выключаюць адзін аднаго. Неабходна ўсведамляць, што рэкрэацыйная функцыя мае права на існаванне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аднак не можа стаць заменай базавых функцый музея – дакументавання, захавання, адукацыйна-выхаваўчай і г.д.

Са сказанага вышэй вынікае, што задача музейных супрацоўнікаў знайсці залатую сярэдзіну ў культурна-адукацыйнай дзейнасці, бо ў крайнасцях жыцця няма, і ў кожную форму культурна-адукацыйнай работы ўносіць свой інтэлект, зацікаўленасць і крэатыўнасць.

У сучасных умовах культурна-адукацыйная дзейнасць музея павінна быць зарыентавана на асобу музейнага наведвальніка як паўнапраўнага суб’екта музейнай камунікацыі. Для ўзмацнення яе эфектыўнасці, неабходна лепш ведаць запатрабаванні музейнай аўдыторыі і актыўна выкарыстоўваць дыферэнцаваны падыход. Гэта значыць, што тэматыка, методыка і іншыя аспекты падрыхтоўкі разнастайных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці павінны быць зарыентаваны на пэўную аўдыторыю (з улікам яе запатрабаванняў, інтарэсаў, узроўню падрыхтоўкі, узросту, месцажыхарства і іншых яе асаблівасцей). Калі сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі музейнай аўдыторыі вядомы даволі добра (яны аналізуюцца пры падрыхтоўцы штогадовых справаздач аб дзейнасці музея), то інтарэсы, захапленні і прыярытэты аўдыторыі ў адносінах да «культурнага прадукта», які прапануюць музеі, амаль не вывучаюцца.

Зразумела, што рэгіянальныя музеі наўрад ці змогуць здзейсніць правядзенне сацыялагічнага даследавання сваёй аўдыторыі. Аднак такія формы вывучэння попыту, як калектыўныя і індывідуальныя гутаркі з наведвальнікамі, анкетаванне (як у музеі, так і ва ўстановах адукацыі) не прадугледжваюць значных выдаткаў, але вельмі павышаюць эфектыўнасць культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. У сучасных умовах да яе добра падыходзіць лозунг канцэпцыі маркетынгу: «Вырабляйце тое, што можна прадаць, замест таго, каб прадаваць тое, што можаце зрабіць».

Сучасны музей толькі вучыцца рэагаваць на змены патрабаванняў наведвальнікаў, але станоўчыя тэндэнцыі назіраюцца нават у такой традыцыйнай форме як, экскурсія. Укараняюцца ў практыку экскурсіі з элементамі музейнай педагогікі – выкарыстоўваюцца гульнявыя і дыялогавыя метады, тэатралізацыя. Атрымала адабрэнне наведвальнікаў практыка стварэння гульнявых пляцовак на дзіцячых выставах. Гэтая форма можа з’яўляцца прыкладам яшчэ адной тэндэнцыі, што пашыраецца ў апошні час у музейнай галіне, – сумяшчэнне адукацыі і забаўлянняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыкуюцца таксама комплексныя экскурсіі, якія аб'ядноўваюць адзінай тэмай паказ помнікаў у музейнай экспазіцыі і помнікаў, што знаходзяцца ў натуральных умовах.

Усё большую папулярнасць у рэгіянальных музеях набывае такая форма працы, як музейна-педагагічныя заняткі, якія распрацоўваюцца для пэўнай аўдыторыі з улікам усіх яе псіхолага-педагагічных характарыстык і, звычайна, паглыбляюць наведвальніка ў адну пэўную тэму. Вельмі станоўчым момантам такой формы працы, як музейна-педагагічны занятак з'яўляецца тое, што гэтая форма можа выкарыстоўвацца для розных узроставых катэгорый наведвальнікаў. Трэба адзначыць, што музейна-педагагічны занятак адрозніваецца ад школьнага не толькі тым, што ён праводзіцца музейным супрацоўнікам. На музейным занятку абавязкова прысутнічае музейны прадмет – сапраўдны сведак даўніны, які наведвальнікі могуць не толькі ўбачыць, але і патрымаць у руках і такім чынам наблізіцца да мінулага, эмацыянальна адчуць яго. Звычайна на такіх занятках выкарыстоўваюцца музейныя прадметы з навукова-дапаможнага фонду музея.

З зацікаўленасцю ўспрымаюць сучасныя наведвальнікі такую форму работы, як музейнае свята. Гэта комплексная форма культурна-адукацыйнай дзейнасці, у якой могуць быць аб'яднаны элементы экскурсіі, тэматычнай вечарыны, тэатралізаванага прадстаўлення і інш. Яшчэ адным цікавым варыянтам музейнага свята з'яўляецца свята рамёстваў, тым больш, што ў рэспубліцы дзейнічае 100 дамоў і цэнтраў рамёстваў, 25 студый і гурткоў па ДПМ, мастацкіх промыслах і рамёствах. Ёсць першыя спробы правядзення музейных свят для дыферэнцаванай аўдыторыіі, рэканструкцыі традыцыйных абрадаў, напрыклад, «Пахаванне стралы» ў Веткаўскім музеі народнай творчасці.

Як станоўчую тэндэнцыю мы расцэньваем актыўнае далучэнне рэгіянальных беларускіх музеяў да міжнароднай акцыі «Ноч музеяў», якая праводзіцца штогод і прымеркавана да Міжнароднага дня музеяў. На прыкладзе плана падрыхтоўкі і правядзення «Ночы музеяў» у Вілейцы, можна скласці ўяўленне аб тым, які вялікі аб'ём працы неабходна ажыццявіць, задзейнічаць амаль усе раённыя структуры, прадумаць шмат дэталяў – ад распрацоўкі сцэнарыя, рэкламных афіш, размяшчэння рэкламы ў СМІ, устаноўкі экранаў, апаратуры, забеспячэння грамадскага і санітарна-гігіенічнага парадку, запрашэння музычных калектываў і асобных выканаўцаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да арганізацыі медыцынскага суправаджэння і пажарнай бяспекі. Відавочна, што «Ноч музеяў» ператвараецца ў сацыякультурную падзею раённага маштабу і музей выступае як яе ініцыятыўны, крэатыўны і каардынацыйны цэнтр. Асаблівае ўражанне выклікае гісторыка-тэатралізаваная частка «Ноч музеяў – 2011», якая адлюстроўвае мінулае Вілейшчыны – ад першабытнага грамадства да сучаснасці.

Як новая тэхналогія ў музейнай справе ўсё большую папулярнасць набывае праектная дзейнасць. Праекты – гэта яскравыя музейныя мерапрыемствы, разлічаныя на грамадскі рэзананс, якія падтрымліваюць станоўчы імідж музея, гэта комплексная форма, у якой спалучаюцца шэраг форм культурна-адукацыйнай дзейнасці. Падаецца, што выкарыстанне праектнай дзейнасці рэгіянальнымі музеямі, таксама з’яўляецца даволі перспектыўным. Рэгіянальнымі музеямі рэалізаваны значныя міжнародныя праекты. У якасці выразнага прыкладу выкарыстаем дзейнасць Капыльскага краязнаўчага музея, зусім не багатага на музейныя прадметы, але багатага на таленавітых людзей. Супрацоўнікі музея ў 2010 г. удзельнічалі ў двух інавацыйных праектах.

Першы – праект праграмы развіцця ААН (праграма Еўрапейскай Камісіі «Падтрымка навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь»). Ініцыятыва музея – стварэнне зялёнага маршруту «Міжрэчча Мажы і Марачы» на базе Семежаўскага сельскага савета. У выніку былі выпушчаны брашура «Міжрэчча Мажы і Марачы», інфармацыйныя буклеты «Вястунка Бога» і «Мядовае царства», уладкаваны інфармацыйнымі шчытамі пасекі, гідралагічны заказнік «Марач», Семежаўскі водаканал, а таксама распрацаваны турыстычны маршрут.

Другі праект «Уклад у сусветную культуру ўраджэнцаў Капыльшчыны, якія імігрыравалі ў пачатку XX ст.» сумесна з таварыствам з ФРГ. За ажыццяўленне праекта атрыманы дыплом і была выдадзена брашура «Навекі постаць сваю захаваўшы», сабраны матэрыял выкарыстаны для экспазіцыі і перасоўнай выставы на трансформерах, што дапамагае даехаць да самых аддаленых вёсак рэгіёна.

Адной з важнейшых задач рэгіянальных музеяў з’яўляецца вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны. Навуковыя даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны ў рэгіянальных музеях можна пэўным чынам сістэматызаваць па такіх відах, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыя выстаў, навуковыя чытанні і канферэнцыі. Як асобы від навукова-даследчай дзейнасці рэгіянальных музеяў можна разглядаць выданне брашур, буклетаў, паштовак, прысвечаных мясцовым музеям і гістарычным памятным мясцінам, культурным каштоўнасцям; віктарыны для вучняў на мясцовым матэрыяле. Важнае месца займаюць выступленні ў друку, на радыё і тэлебачанні. На падставе навуковых даследаванняў рэгіянальных музеяў напісаны многія артыкулы, у тым ліку для БелСЭ, кніг «Памяць», гісторыка-краязнаўчыя ці гісторыка-эканамічныя нарысы. У рэгіянальных музеях працуюць над складаннем рэестра гістарычных і памятных мясцін рэгіёна, картатэк народных легенд і паданняў, стварэннем фільмаў цыкла «Малая радзіма» (напрыклад, Лагойскі і Вілейскі раённыя музеі), распрацоўкай экскурсійных маршрутаў, стварэннем краязнаўчых інтэрнэт-сайтаў.

Такім чынам, рэгіянальныя музеі займаюць выразна адзначаную нішу ў сацыякультурным асяроддзі рэгіёна. Характэрным прызнакам іх дзейнасці з'яўляецца яе разнастайнасць, што дазваляе вырашаць важнейшыя задачы як у развіцці саміх музеяў, так і рэгіёна ў цэлым. Эфектыўнасць гэтай дзейнасці ўзрастае ў шмат разоў пры ўмове шчыльнага супрацоўніцтва музеяў з установамі сацыякультурнай сферы рэгіёнаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ